шэнкі, які абураўся дэфіцытам то яек, то малака: „Калі мы ўзяліся за яйцы — малако прапала“.

На Каляды абавязкова пакладзіце ў мех калядоўнікам тры *яйкі* — сымбаль новага тысячагодзьдзя.

## Яма

***Анатоль Вярцінскі***

*Яма, яміна, ямка* — адно з самых сэмантычна напоўненых словаў нашай мовы. Для беларуса, для яго пабытовай сьвядомасьці, гістарычнай памяці, гэта — склеп, зямлянка, калдобіна і акоп, падвал і траншэя, нара і роў, канава і яр і, вядома ж, — магіла.

*Жывым у яму не палезеш, не капай яму свайму бліжняму.* Гэтак гучала спрадвечная мудрасьць народу.

Але насуперак ёй далакопы рабілі сваю чорную справу, стралялі і скідвалі ў *ямы* штабялямі гэтых самых ні ў чым не вінаватых сваіх бліжніх. У выніку гэтай іхняй кіпучай дзейнасьці на беларускай зямельцы ўтварыліся незьлічоныя *ямы*-магілы. *Ямы*-магілы ў Курапатах, *ямы*-магілы ў ваколіцах Магілёва, Воршы, Вялейкі, Бабруйску, Гомеля.

*Яма. Яма* эмацыянальная, *яма* духоўная, *яма* прававая, *яма* маральна-палітычная, і *яма*, у фігуральным сэнсе, ваўчыная — гэта ўжо калі чалавек падыходзіць да бездані, калі ў яго ўжо зьнікае магчымасьць жыць.

„Во трапіў у ваўчыную *яму*, колькі куды ні скачы — ня выскачыш“, — горка зазначае ў сваіх перадсьмяротных развагах герой аповесьці Васіля Быкава, якая так і называецца — „Ваўчыная *яма*“.

## Слова

***Валянцін Акудовіч***

*Слова* — што тут казаць — Бог. Цуд маўленьня — найвялікшы на гэтым сьвеце. У параўнаньні зь ім нішто нават само стварэньне сьвету. Нявымаўлены і праз маўленьне ня выяўлены сьвет — нешта настолькі жахлівае, што ня мае роўнажахлівага слова.

Узьнікаюць і гінуць галяктыкі, запальваюцца і згасаюць сонцы, плывуць над сьнягамі аблокі, туляцца ў пушчах зьвяры, а ў водах — рыбы. Але бяз *слова* ўсяго гэтага дзіва ніхто ня бачыць, не трымае ў памяці, не беражэ да наступнага дня. І хаця сьвішча вецер, трушчацца камяні, рыкае зьвер, аднак глухая цішыня няўцямнасьці пануе ўсюдна: усё ёсьць — і нічога няма. Жудаснае відовішча. Як быццам чалавек яшчэ не нарадзіўся, а ўжо памёр.

Пакуль сьвет ня быў названы сьветам — яго як не было. Усё, што ёсьць — ёсьць толькі таму, што мае сваё *слова*.

Адам, надаўшы істотам ды існасьцям імёны, вызваліў іх зь вязьніцы небыцьця. І тады ўсё, што было, сталася *словам*, а што ня сталася *словам*, таго не знайсьці.

Натуральна, *слова* — Бог. Спачатку было *слова*. Напрыканцы *слова* зноў ня будзе.

Апакаліпсыс — гэта ня енк, ня лямант, не мальба. Апакаліпсыс — гэта той дзень, калі нам усім разам адыме мову. „Гэта канец сьвету“, — пасьпее сказаць чалавек, але ўжо не пачуе ніводнага *слова*.